УДК 882.6.073+882.6(092)

# Аказіянальная лексіка ў творчасці Алеся Разанава

Івашчанка А.С.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Сучасныя беларускія паэты нярэдка ўводзяць у свае тэксты аказіянальную лексіку. Адным з найбольш заўважных вынаходнікаў аказіяналізмаў – флагман інтэлектуальнай паэзіі А. Разанаў.

У дакладзе даследуюцца спосабы ўтварэння аказіяналізмаў у творчасці А. Разанава. Ужо самі назвы эксперыментальна-аўтарскіх паэтычных формаў, вынайдзеных А. Разанавым, з'яўляюцца аказіяналізмамі (*квантэмы, вершаказы, версэты, зномы*).

Разглядаецца ўтварэнне такіх разанаўскіх аказіяналізмаў і аказіянальных выразаў, як *ведзьмавала* (верш "Радзіма"), *мембранна* ("Балада пратэсту"), *"міжчассе", "прадчассе", "утульвацца ў бяспеку" – "адтульвацца для свабоды"* (рыфмаваныя пункціры), *"рунлівее"* (вершаказ "Рунь"), *птахчымасці* (вершаказ "Птах"), "невідзімнасць" ("Дым"), "*праўчора*" ("Пячора"), "*раскалоджвацца*" ("Калода") і інш. Структурны аналіз спосабаў утварэння аказіяналізмаў выяўляе, што найбольш прадуктыўнасцю ва ўтварэнні аказіянальных слоў валодае форма вершаказу.

Не толькі ў паэтычных формах А. Разанава прысутнічае аказіянальная лексіка, але і ў яго літаратурна-крытычных артыкулах, а таксама ў жанры філасофскай мініяцюры (знома), мова якіх выходзіць па-за межы звыклага нарматыўнага літаратуразнаўства, аперуючы такімі катэгорыямі і паняццямі (часам нават аказіянальнымі), як "ток мовы", "экстатычны і медытатыўны", "ультрагукавы і інтрагукавы", "энергетычнае дрэва творчасці", "дапаняццйны сэнс", "іншаведанне", "паэзія – магстацтва" і г.д.

Аказіянальная лексіка сучаснай беларускай паэзіі – малавывучаная частка словатворчасці, выкарыстанне якой з'яўляецца прадуктыўным шляхам узбагачэння вобразнасці паэтычнага тэксту і патрабуе ўдумлівага вывучэння.